# Да выпуску рабфакаўцаў БДУ

Рабочая кляса СССР пад кіраўніцтвам сваей камуністычнай партыі і яе Ленінскага ЦК уступіла ў пэрыяд сацыялізму. Дзякуючы рэвалюцыйнаму энтузіязму рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас, аб'ядналочых у калгасы, з вялізарным посьпехам выконваецца і перавыконваецца прамфінплян трэцяга рашаючага году пяцігодкі за чатыры гады. Пабудована і будуецца шмат гігантаў заводаў, фабрык, электрастанцый, МТС і інш. На базе шпарка растучай сацыялістычнай прамысловасьці з нябачным посьпехам рэканструктуецца сельская гаспадарка на сацыялістычнай аснове. У асноўных зерна вых раёнах СССР заканчваецца калектывізацыя вёскі і на яе асно ве ліквідацыя кулацтва як клясы. Нашаму рашучаму сацыялістычнаму наступленьню на рэшткі капіталістычных элемэнтаў аказваюць шалёнае супраціўленьне ворагі ра бочае клясы, ворагі дыктатуры пралетарыяту ў тым ліку і частка спэцыялістых. Гэта яскрава падцьвярждаюць выкрытыя ДПУ шкодніцкія контррэвалюцыйныя арганізацыі—„Прампартыя“ „ТКП“, група беларускіх контррэвалюцыйных нац дэмаў, меншавікі - контррэвалюцыянэры і інш. Усе яны вялі падрыўную працу супроць сацыялістычнага будаўніцтва, супроць дыктатуры пралетарыяту, падрыхтоўваючы інтэрвэнцыю капіталістычных дзяржаў супроць СССР.

Рабочая кляса пад кіраўніцтвам кампартыі і яе Ленінскага ЦК вы крыла ўсіх гэтых шкоднікаў контр рэвалюцыянэраў і дала руйнуючы адпор усялякім спробам іх падарваць посьпяховы ход сацыялістыч нага будаўніцтва. Нашы ВУЗ'ы і ВТУЗ'ы, як кузьні па падрыхтоўцы пралетарскіх спэцыялістых, у адказ на выкрытыя шкодніцтва з боку часткі спэцыялістых шпаркі мі тэмпамі рыхтуюць новых пралетарскіх спэцыялістых, кроўна зацікаўленых ў сацыялістычным будаўніцтве. Вашым выпускам т.т. рабфакаўцы, мы ўліваем новую пралетарскую струю ў нашы ВУЗ'ы і ВТУЗ'ы. Цьвёрда ўпэўнен, што вы і ў ВУЗ'ах, як і будучы на Рабфаку з неаслабным рэвалюцыйным энтузіязмам будзеце працягваць вашу вучобу па атрыманьні наву ковых ведаў па пэўнай спэцыяльнасьці мэтадам сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Шчыра жадаю вам доб рых посьпехаў у вашай вялікай пады ходзячай працы па аўладаньні марксыцка-ленінскай мэтадалёгіяй і на вуковымі спэцыяльнымі ведамі.

Рэктар БДУ Я. КАРАНЕЎСКІ.

# ВЫНІКІ КОНКУРСА

## Лепшыя ўдарнікі

II гр. (б)—цалкам

Трохкутнік III групы: Зельцэр, Рубінштэйн, Бернштэйн

Дзядзюля . . II гр.
Рухлевіч . . . V „
Міхалевіч . . VI „
Сьпявак . . . VIII „
Бернштэн . . IX „

## Зрыўшчыкі сацспаборніцтва

VII гр.—цалкам

Бярковіч . . VIII гр.
Залуцкі . . . IV „
Міньковіч . . III „
Пікулін . . . III „

*Штаб конкурсу*

# А б 'я в а

**РАБФАК пры Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце абвяшчае васеньні набор на ДЗЁННЫ Рабфак, на якім адкрыты аддзяленьні:**

**БЕЛАРУСКАЕ,**

**ПОЛЬСКАЕ,**

**і ЯЎРЭЙСКАЕ**

Жадаючыя паступіць на РФ павінны мець наступныя дакумэнты:

1) Камандыроўку, на спэцыяльных блянках НКА.
2) Засьведчаную анкету.
3) Даведку аб сацыяльным становішчы і вашых бацькоў.
4) Спраўку аб вытворчым стажы для рабочага.
5) Даведку аб адукацыі.
6) Аб узросьце.
7) Аб здароўі.

**Прыём заяў да 1 жніўня. Дакуманты можна прысылаць па пошце па адрасу:**

Менск, Унівэрсытэцкі Гарадок, Галоўны корпус, Рабфак БДУ пакой № 3-14.

**ДЭКАНАТ.**

# Абывацельшчына, ці больш?

Калі мы зараз з усёй вострай той ставім пытаньньне аб неабходнасьці хутчэйшай падрыхтоўкі пралетарскіх спэцыялістых для БССР, нам патрэбна аглянуцца на нас самых, ці ўсё добра?

Аб тым, што ў нас яшчэ ня зусім дабра. можа пасьведчыць хаця-б тая сцэнка, якая адбылася ў 8 гр., у той самай групе, якую мы зараз выпускаем з сьцен Рабфаку.

Вось яна:

Пачынае гаварыць Клаз:

—Я ды застануся у гэтай Беларусі??? —Цьфу!!! Гіблае месца! Ніколі!!! Іншая справа Масква, Электратэхнічны!!! А калі не адпусьцяць, дык зраблю як мой брат зрабіў: скажу што, іду у Чырвоную армію, забяру дакумэнцікі і.... айда ў Маскву, а там, зноў адсрочку вазьму.

Яму „супярэчыць“ Бярковіч: —Э, братка, што электратэхнічны?? Вось „Мэндэлееўка“! Гэта да! Я скажу, што ў мяне там „бедненькая“ жонка страдае і... скучае па мне. Няўжо ў Дэкана каменнае сэрца і ня пусьціць мяне да яе??? А?

Тут зайдросна стала Рыўкіну, і ён многазначна прагаварыў: — Што Мэндэлееўка? Гэта, брат, ого-го! і тут жа тоненькім галасочкам прапішчэў „Бярковіч, бяры мяне з сабой у Мэндэлееўку!“.

Апошні гаварыў Гуткін. У яго голасе адчуваўся нейкі пэсімізм: Ён пачынае так:

— Чуе мае сэрца, браткі, няўбачыць мне Масквы, дык хоць бы ў Хэмічны Інстытут у Менску адпусьцілі! Усё-ж такі інжынэрам зваца буду.

Пры выніках беларусізацыі гэтая чацьвёрка аказалася на апошнім мейсцы ў сэнсе ужываньня беларускае мовы.

Што гэта азначае: нежаданьне вучыцца ў Б. Дз. У.? Ігнараваньне беларускай мовы?— О, не, гэта больш... гэта ёсьць яскравыя праявы вялікадзяржаўнага шавінізму. Ф. Л.

# Вынікі конкурса

Гіганцкі рост сацыялістычнага будаўніцтва ставіць перад навучальнымі установамі вялізарнейшыя задачы.

Аднэй з галоўнейшых-гэта падрыхтоўка пралетарскіх кадраў. Для хутчэйшага выкананьня пастаўленых перад намі задач, мы павінны карэнным образам перабудаваць нашу работу з такім разьлікам, каб як лепш выканаць нашы навучальныя пляны. Трэба з гонарам заявіць, што нам гэта ўдалося зрабіць. У выніку чаго мы маем, што студэнты Рабфаку ў сваёй практычнай працы ўжываюць усё новыя мэтады працы, як сац спаборніцтва і ўдарніцтва. Рабфакаўцы ў час конкурса былі ахоплены ўдарным рухам, што зьяўлялася лепшым залогам для выкананьня нав. праграм. Неабходна падкрэсьліць. што конкурс даў вельмі добрыя вынікі. Галоўныя з іх: 1) палепшаньне дысцыпліны, 2) ліквідацыя спазьненьняў і пропускаў на лекцыі, 3) Палепшылася якасьць прапрацоўкі прадметаў.

4) Ліквідацыя запазычанасьці па заданьнях і інш.

Гэтыя вынікі атрымалі дзякуючы таму, што мы сумелі накіраваць усю ўвагу студэнтаў вакол выкананьня канкрэтных задач.

Побач з гэтым мелі і недахопы. Як ілжэ-ударніцтва ігнараваньне белмовы і інш.

Для прыкладу можна ілюстраваць такі факт: акадэм працаўнік 8 групы 3 курсу т. Бярковіч будучы старшым брыгадзірам у групе зрываў сацспаборніцтва і ўдарніцтва. У чым справа? Справа заключаецца ў тым, што ён у час заняткаў хадзіў сьнедаць абедаць, і часта спазьняўся на лекцыі. Часта падрываў заняткі тым, што ня прыносіў у час кнігі з бібліятэкі. Усе гэтыя факты дапамагалі паслабленьню дысцыпліны і зьяўляліся вынікам частковага недавыкананьня с а ц с п а б о р н і ц т в а. Але група дала рашучы адпор такім лжэударнікм Был іга кі факт: студэнт 3 гр. 1 курсу тав. Пікулін адмовіўся ўступіць у конкурс. Нагляда ліся і такія моманты, як ігнараваньне белмовы. Студэнт 8 групы 3 курсу Іолк Саламон не жадаў і не жадае ўжываць белмову- для яго гэта рэч непатрэбная. Такіх падобных фактаў можна прывесьці шмат.

У заключэньне трэба ўказаць наступнае: калі нам поўнасьцю ўдасца замацаваць усе дасягненьні і адначасова зьнішчыць, маючыяся недахопы, то мы з посьпехам выканаем навучальныя праграмы. Клёнер.

# Недастатковая падрыхтоўка да конкурсу

Конкурс на лепшую групу, конкурс на лепшую брыгаду і проста конкурс, як часта чуецца гэтыя словы цяпер на Рабфаку. Што-ж зрабілі студэнцкія арганізацыі. як вялі працу з студэнцкаю масаю? Адказ давалі сумны. Яны рыхтаваліся габінэтным парадкам. Камісія конкурсу зрабіла некалькі паседжаньняў, адарваўшыся ад студэнцкай масы і гэтым—малая падрыхтоука студэнтаў да конкурсу.

Некаторыя студэнты не зразумелі тых мэт, якія ставіць конкурс. У выніку спробы некаторых адмовіцца ад конкурсу, як т. Пікулін І-га курсу. Пагаршэньне якасьці здачы заданьняў аднэй брыгадай 3 гр., што прывяло нават да адмаўленьня настаўніка па матэматыцы ад працы ёму заданьняў гэтай брыгады. Насьценная газэта, якая павінна адыграць значную ролю ў барацьбе за ўдарныя тэмпы нашай вучобы, амаль не займалася пытаньньнем конкурсу. Штаб конкурсу ў першыя дні горача ўзяўся за гэтую справу. Намалявалі плякаты „Стой! зьвярні ўвагу!“ Адзначаў спазьненьні і пропускі. Гэта спрыяла паляпшэньню наведваньня студэнтамі лябараторыі. А потым штаб, зда ецца, астыў. Штаб слаба праверае правідловасьць зьвестак, якія яму даюцца. 6 група паспрабавала, напрыклад, не даваць спачатку вестак аб спазьненьнях, каб быць першай у конкурсе.

Трэба памятаць, што конкурс не на "вціраньне ачкоў", а на сапраўды лепшую па-бальшавіцку ударную групу, або брыгаду. Бязумоўна, конкурс нам шмат дапаможа ў паляпшэньні нашай працы. у разьвіцці яшчэ больш шпаркіх тэмпаў падрыхтоўкі кад раў, толькі кожнаму студэнту з бальшавіцкай сьвядомасьцю трэба адносіцца да конкурсу.

Г. Палей.

# Адказ студкорам

**КАЦМАНУ, ЦАРФІНУ,'БОЛЕЛУ—вашы допісы не зьмяшчаем, з-за адсутнасьці месца'. Яны будуць друкавацца ў насьценнай газэце.**

**ЯЎЛАНАВУ—твой верш не зьмяшчаем з-за адсутнасьці 'месца. Пойдзе у насьценнай газэце.**

**ХАЙКІНУ—твой вялізарнейшы артыкул ня мае канкрэтных фактаў, ня мае зьместу. А таму друкавацца ня будзе.**

**РЭДКАЛЕГІЯ.**

**РЭДКАЛЕГІЯ: Сьвярдлоў С.. Лібін Ф., Астроўскі, Хануцін, Царт Л.**

Галоўлітбел 1540 Заказ № 326 Тыраж 1000 Вуч. друкарня Камвузу

# 10 год Рабфаку— 10 год барацьбы за пралетарскую культуру

## Ваянізацыя на Рабфаку

Асноўная мэта вайсковай падрыхтоўкі на рабфаку—даць студэнцтву неабходны мінімум вайсковых паняцьцяў і практычных навыкаў для адзіночнага байца пяхоты, здольнага к дзействам у складзе дробных падразьдзяленьняў—аддзяленьня і разьдзелу з вучотам у духу інтэрнацыяналізму і разуменьня клясавых задач Чырвонай арміі.

Як-жа ў нас на Рабфаку БДУ абстаіць справа з ваянізацыяй? Існуючы дагэтуль парадак праходжаньня вайсковых дысцыплін з расьцяжкай на ўвесь вучэбны год, ня больш 2 дзён ў дэкаду дала малую прадукцыйнасьць працы, асабліва ў сэнсе прывіцьця практычных навыкаў. Улічваючы гэтыя абставіны, існуючы дагэтуль парадак вайсковай падрыхтоўкі на Рабфаку ў канцы красавіка быў спынены з тым, каб гэтую падрыхтоўку правесьці ў больш спрыяючых умовах з найлепшым посьпехам.

У якасьці вопыту вайсковая падрыхтоўка на Рабфаку зараз накіравана па шляху арганізацыі спэцыяльных вайсковых збораў у рамках усяго Рабфаку.

Такі збор адбываўся з 11 па 14 чэрвеня ўключна.

Што даў гэты збор?

Першае, належнае і сваячасовае стварэньне грамадзкай думкі вакол гэтага збору, узьняла высокую сьвядомасьць студэнцтва да збору і іх добрасумленныя адносіны да працы, што зьяўляецца асноўным і дапамагае нармальнаму ходу вучобы.

Па-другое—апыпеньне студэнтаў ва ўмовах вайсковай абстаноўкі стварыла магчымасьць узаемападцягваньня студэнцтва, дала ў асноўным высокую дысцыплінаванасьць і што асабліва важна, дала магчымасьць вайсковых занят каў практычным ухілам (выхад у поле) ва ўмовах шырока разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Вось асноўныя дадатныя бакі збору. Трэба сказаць, што гэты збор сябе апраўдаў. Настрой рабфакаў цаў быў бадзёры. Мелася жаданьне атрымаць як мага больш за гэтыя 4 дні.

Відавочныя ўдарныя тэмпы вучобы ня зьмяняюцца.

Маецца ўжо шмат паказальнікаў высокай, добраякаснай працы па ўсіх дысцыплінах.

Ня спыняйце ўдарныя тэмпы, рабфакаўцы!

Мацней трымайце ў руках зброю!

Час расправы з міжнароднай буржуазіяй ужо блізак. Вы павінны будзеце стаяць у першых шэрагах і быць прыкладнымі байцамі за сусьветны Кастрычнік!

Сьпегальскі.



## „ГЭРОЙ"

Ёсьць у нас група, якая чамусьці завецца „восьмай" і ёсьць у ёй студэнт Берковіч, які чамусьці завецца „акадэмпрацаўнік" гэтай самай групы.

Ня варта было-б гаварыць аб гэтым паважаным акадэмпрацаўніку, калі-б ён не адлічаўся вельмі цікавымі асаблівасьцямі. Я укажу толькі некаторыя з іх.

Ня дзіва, што тав. Берковіч з гонарам носіць імя „чалавек-хроніка", бо ён усе здарэньні за дзень зараз разнюхае. І ня варта вам у чарзе за газай стаяць, каб атрымаць якую-небудзь плётку, можаце атрымаць яе ў тав. Бярковіча.

Гэтая асаблівасьць дапаўняецца яшчэ тым, што тав. Бярковіч ні перад чым не застановіцца, каб выйсьці сухім з вады, дзеля гэтага ён гатоў апаганіць „абліць памыямі" таварыша. Быў такі цікавы выпадак у нас. Варта яго паслухаць.

Асабістыя рахункі нас мала цікавяць. Але калі гэтыя рахункі выкарыстоўваюць дзеля грамадзкіх мэтаў, тут ужо мы павінны зацікавіцца.

Тав. Берковіч меў асабісты рахунак з таварышом. Трэба яго якнебудзь апаганіць і вось тав. Берковіч склікае сход, як акадэмпрацаўнік і высунуўшы нейкія ілжывыя довады прапанаваў вывесіць гэтага таварыша на чорную дошку.

Але сход адразу раскусіў гэтыя брыдкія манэўры т. Берковіча.

Берковіч забыўся, што ён—галоўны зрыўшчык сац. умовы, „гэрой" прагулаў у групе. Агульны сход гэта не запамятаваў і пастанавіў выставіць яго на чорную дошку і зьняць абавязкі акадэмпрацаўніка.

Ці-ж гэта не сапраўдны гэрой?

Рыўкін.

## Zlikwidujmy wyrwę do konca roku szkolnego

Polski wydział Rabfaký BPU został zorganizowany 1-go października 1930 roku. Na wydział ten przyjmują się tylko robotnicy i chłopi kolektywnicy. Co prawda są i tacy robotnicy, którzy posiadają bardzo mały staż pracy. Wielu wstąpiło na Rabfak nie umiejąc prawie czytać i pisać po polsku. Zpoczątku roku szkolnego na polskim wydziale uczyło się 32 studentów, z niewiadomych przyczyn wybyło 2-ch. Częste zmiany kierowników odbiły się również na pracy grupy. Często zrywano lekcje, szczególnie z języka polskiego, gieografji i społecznoznawstwa. Dzięki energicznej pracy nowego kierownika poziom nauki podnisł się do należytego stopnia, jak również poziom pracy społeczno-organizacyjnej.

W celu okazywania pomocy grupom słabszym zorganizowano brygady szturmowe. Wyniki są zadawalniające.

Mimo to, że na Rabfak przyszli studenci dosyć słabo przygotowani, jednak mielismy nadzieję, że przy wytężonej pracy zdążymy wykonać nasz promfinplan. Lecz i tu niestety napotkaliśmy na pewne przeszkody, a mianowicie, t. Zarębskiego, kierownika naszego wydziału, oderwano na kilka miesięcy od pracy, nie dając odpowiedniej zamiany. Powtorzył się ten sam obraz, jak i poprzednio—zrywy lekcji, brak kierownictwa. Dekant Rabfaku również nie zainteresował się tą sprawą, chociaż nie jednokrotnie było o tym mówiono. Nie ulega wątpliwości, że takie zmiany ujemnie odbijają się na stanie pracy. Program z przyrody wykonalismy nieźle, z matematyki program zakonczylimy, rezultaty jednak dość słabe. Z języka białotuskiego i rosyjskiego wywiązujemy się doskonale, ze społecznoznawstwa, gieografji i języka polskiego pozostalismy daleko w tyle. Sądzimy jednak, wykonamy nasz promfinplan do końca roku szkolnego.

Wszyscy do pracy—do likwidacji wyrwl

Urzeczywistniajmy uchwały naszej partji komunistycznej!

Zastosujmy bolszewickie hasło „Dopędzić i przescignąć" na podstawie szturmowości i współzawodnictwa socjalistycznego!

P.

## Zabezpieczymi nowy zaciąg na polski wydział Rabfaku

Szybki rozwój zapotrzebowań kulturalnych pracujących mas ludności polskfej BSSR, dzięki słusznemu urzeczywistnianiu zasad leninowskiej polityki narodowościowej, wymaga bolszewickiej wytężonej pracy, jak ze strony Ludowego Komisarjatu Oświaty, taksamo i ze strony Polskiego Wydyiału Rabfaku w celu przygotowania proletarjackich kadrów.

Otwarcie polskiego wydziału na naszym fakultecie robotniczym rozszerzyło znacznie bazę przygotowania młodych proletarjackich kadrów dla pracy wśród pracujacych mas ludności polskiej.

Sprawa zaciągu na Polski wydział Rabfaku stała się dzis jedną z ważniejszych spraw organizacyjnych.

W myśl uchwały Kolegjum Ludowego Komisarjatu Oświatu nowy zaciąg na pierwszy kurs powinien być w całości zabezpieczony. Praktyka ubiegłego roku pokazała, że w sprawach zaciągu były dopuszczone pewne omyłki, wyrażające się w niedostatecznym popularyzowaniu ważności zaciągu na polski wydział Rabfaku.

W tej ważnej pracy zaciągowej bezwarunkowo powinny wziąć udział studenci polskiego wydziału, jak i Rabfak w całości wraz z organizacjami studenckiemi, organizując specjalne brygady zaciągowe, wydzielając specjalnych pełnomocników na fabrykach w sprawie zaciągu, popularyzując wśród robotniczych polskich mas cele i zadania Rabfaku.

Wszystkie siły skierować na całkowite zabezpieczenie nowego zaciągu na polski widział Rabfaku.

Z. F.



